Ігуменскі тракт

№ 43 (58)

■ Фаліянты

ПЕРШЫ ТОМ ПЕРШАДРУКАРА

У апошнія дні снежня ўрачыста падпісаны ў друк першы том факсімільнага выдання поўнага збору кніг Францыска Скарыны. Цягам бліжэйшых некалькіх гадоў свет пабачаць і іншыя працы нашага першадрукара і першавыдаўца.

Плануецца выпусціць факсімільнае выданне 25 кніг у 20 тамах, надрукаваных Скарынам у Празе і Вільні. У іх захаваюцца структура, змест, асаблівасці шрыфтоў і гравюры арыгінальных кніг, а таксама будуць перададзены асаблівасці, набытыя выданнямі за іх 500-гадовае існаванне. Усе тэксты будуць суправаджацца каментарыямі навукоўцаў, перакладамі прадмоў і пасляслоўяў на беларускую, рускую і англійскую мовы.

Першы намеснік міністра культуры Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ, які прысутнічаў на ўрачыстасці ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, адзначыў, што такім чынам ствараецца электронная бібліятэка выданняў першадрукара:

— Гэты праект уваходзіць у дзяржаўную праграму «Культура Беларусі» на 2011—2015 гады і прадугледжвае атрыманне па абмене або набыццё электронных копій усіх вядомых выданняў і рукапісных спісаў Францыска Скарыны, якія знаходзяцца ў сховішчах розных краін. У фондах Нацыянальнай бібліятэкі ёсць толькі 10 арыгінальных пражскіх выданняў Бібліі нашага кнігавыдаўца. Увогуле ў свеце на сёння выяўлена каля 360 друкаваных асобнікаў выданняў Скарыны. Яны захоўваюцца ў бібліятэках і музеях Вялікабрытаніі, Германіі, Літвы, Польшчы, Славеніі, Расіі і Украіны.

Адметна, што Францыск Скарына быў першадрукаром не толькі для беларусаў, але і для ўсіх усходніх славян. Большасць тых, хто пачынаў кнігавыданне пасля яго, спасылаліся на вопыт папярэдніка. **Доктар гістарычных навук Рыгор ГАЛЕНЧАНКА** заўважыў:

— Наша кнігадрукаванне з'явілася прыкладна на 50 гадоў раней, чым у Маскоўскім княстве, маюцца звесткі, што незадоўга да гэтага Скарына наведваў расійскую сталіцу. Ва Украіне ўласныя кнігі з'явіліся яшчэ пазней. Прычыну гэтага можна ўбачыць у тым, што ўзровень развіцця беларускіх земляў у складзе Вялікага Княства Літоўскага быў даволі высокім. XVI стагоддзе, параўноўваючы з антычнасцю, пісьменнікі называюць «залатым векам», адным з першых актыўных дзеячаў яго быў Францыск Скарына. За ім ішлі Сымон Будны, які спасылаўся і цытаваў пераклады папярэдніка, Васіль Цяпінскі таксама быў добра знаёмы з яго працамі. Скарыну можна лічыць першым рэнесансным дзеячам на Беларусі таму, што ён, свецкая асоба, адразу ўзяўся за самае сур'ёзнае і святое выданне — кніг Бібліі. Ён заклаў пачатак біблейскай пераемнасці, таксама апярэдзіўшы суседнія краіны. Скарына ўспрымаецца намі і як дэмакрат, бо кнігі Пісання зрабіў даступнымі ўсім саслоўям.

Трэба дадаць, што ў 2017 годзе дзякуючы Скарыну ў Беларусі будзе адзначацца 500-годдзе айчыннага кнігадрукавання.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

■ Дзеля памяці

КРЫЖЫ ПАЎСТАНЦАЎ

150-ю гадавіну паўстання Кастуся Каліноўскага беларусы ўшаноўвалі цягам усяго 2013 года. Мерапрыемствы, канферэнцыі і прэзентацыі кніг, прысвечаныя гэтаму слаўнаму юбілею, прайшлі ў Беларусі, Літве, Польшчы.

Ідэі, словы паўстанцаў луналі сёлета ў паветры ды натхнялі на годныя ўчынкі. Таму абсалютна лагічна, што сярод беларусаў нарадзілася грамадская ініцыятыва ўшанаваць памяць касіянераў, усталяваўшы помнік. Так, у вёсцы Слабодка Астравецкага раёна паўстаў гранітны манумент у выглядзе мяча, уваткнутага ў зямлю. Помнік, прысвечаны паўстанцам 1863 года, зроблены выключна на прыватныя сродкі.

— У гэтай работы шмат прачытанняў, — пракаментаваў скульптурную выяву яе аўтар **Ігар Засімовіч.** — У першую чаргу гэта ўшанаванне памяці тых, хто загінуў у паўстанні. Тым больш што спрадвеку свой меч ваяры выкарыстоўвалі яшчэ і як крыж: на яго хрысціліся, ім праводзілі загінулых у апошні шлях. Па-другое, гэта бязмерная ўдзячнасць нашчадкаў за адвагу, з якой нашы продкі з косамі ў руках ішлі на царскія гарматы. Два крыжы (каталіцкі і праваслаўны) на дзяржальне мяча маюць агульную перакладзіну: сімвал адзінства хрысціян краіны, якія заўсёды разам — плячо да пляча — змагаліся за яе свабоду. А надпіс на лязе мяча: «Каго любіш? — Беларусь! — То ўзаемна...» — гэта пароль, якім касіянеры абменьваліся паміж сабой.

Меч на пагорку стаў маўклівым напамінам нашчадкам пра ўсіх, хто загінуў за Радзіму. Цяпер ідзе праца па стварэнні інфраструктуры, і ўжо праз некаторы час вёска Слабодка будзе вітаць як замежных турыстаў, так і беларусаў на гэтым знакавым для кожнага з нас месцы.

■ Брэнд краіны

КЕРАМІКА ЯК АНТЫСТРЭС,
АБО АКАРЫНА — ІНСТРУМЕНТ ОФІСНЫХ СУПРАЦОЎНІКАЎ

З дома майстра-керамічста Івана Дашкова і яго жонкі мы вярталіся шчаслівымі і заспакоенымі. Прычынай таму — мяккае, па-беларуску пяшчотнае гучанне народных інструментаў — свістулек, акарын, якое мы пачулі ў іх майстэрні, ды і самі паспрабавалі на іх зайграць. Здавалася, душа раскрывалася ў гэты час і, імкнучыся пераадолець будзённыя клопаты, залівалася стройнай песняй. Выпрамянвалі цеплыню і самі гаспадары, якія знайшлі ў народнай творчасці не толькі свае карані, але і спосаб зарабляць на жыццё ў сучасным прагматычным свеце. Яны здаваліся тымі шчасліўчыкамі, што змаглі саскочыць з рэек няспыннага часу і сталі займацца спакойнай ручной творчасцю.

Іван Дашкоў кажа, што выпадкова стаў керамістам. Ён збіраўся паступаць на акцёра, але зламаў нагу: дэманстраваць «сцэнічны рух» стала немагчымым. Маці папрасіла яго пайсці вучыцца ва Універсітэт культуры — і ён, пагадзіўшыся, трапіў на аддзяленне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. На трэцім курсе ажаніўся, на пятым ужо меў дзіця. Трэба было неяк зарабляць грошы на сям'ю. Былі для гэтага больш простыя шляхі, але малады майстар адразу адкінуў іх, бо не бачыў перспектывы. Ён сабраў грошы: штосьці прадаў, штосьці пазычыў — ды і набыў ганчарную печку, каб абпальваць у ёй свае вырабы. Упраўляцца з такім агрэгатам вучыўся метадам уласных спроб і памылак — па колеры выраб аў стаў вызначаць, ці гатовыя яны. Паступова засвоіў розныя ганчарныя тэхнікі. І цяпер Дашкоў узначальвае секцыю керамікі беларускага Саюза майстроў.

Жонка Юля займаецца валяннем (дарэчы на аўтобусным прыпынку яны сустрэлі нас у яркіх, вясёлых шапках, зробленых з лямцу). Цяпер у вольныя ад мацярынскіх клопатаў часіны (Дашковы маюць ужо двух сыноў) яна дапамагае мужу ляпіць свістулькі — штук па пяць на дзень, болей не атрымліваецца. Дарэчы, на курсы аўтамабільных кіроўцаў маладая пара таксама пайшла разам.

Дзеці Дашковых, толькі прачнуўшыся ад абедзеннага сну, адразу пачынаюць свісцець і забягаюць у пакой з глінянымі цацкамі ў руках. Яны таксама любяць завітаць у майстэрню бацькі, штосьці паляпіць, пагуляцца з глінай. А ён паступова пачынае вучыць іх сваім сакрэтам...

Нядаўняя распрацоўка майстра — старажытны інструмент

акарына, зроблены на замову Універсітэта культуры для кафедры народных музычных інструментаў. Дарэчы, спасылаючыся на знаёмага арт-тэрапеўта, Іван адзначае, што акарына — гэта інструмент актуальны ў XXI стагоддзі. Офіснаму супрацоўніку падчас абедзеннага перапынку было б вельмі карысна не толькі выпіць кавы, але і хвілін 5-10 пайграць на акарыне. У яе вельмі глыбокае гучанне, якое супакойвае, усе праблемы і клопаты адыходзяць на другі план.

Акарыны.

Я паспрабавала зайграць на акарыне, паступова адкрываючы і зацiскаючы дзірачкі. Гукі быццам забралі ў палон, у іншы, запаволены свет. Ад гэтага інструмента цяжка адарвацца, ён быццам вяртае цябе да вытокаў, да чагосьці сапраўднага і вельмі прыгожага. Іван Дашкоў адзначае:

— Шмат хто набывае акарыну як так званую «цацку рэлаксу для дарослага чалавека». Прыходзяць дарослыя людзі, нават пенсіянеры, яны бяруць інструмент — і ўжо праз дзве-тры хвіліны ў іх нешта выходзіць. Ад самога гучання атрымліваеш асалоду, але калі паставіць перад сабой адпаведную мэту, то можна падбіраць мелодыі. У акарын вельмі мяккі, прыемны тэмбр гучання. Іграючы, ты быццам некуды выходзіш на пару хвілін...

Свістулек у майстэрні Дашкова таксама надзвычай шмат, прычым самых розных памераў і формаў: куры, іншыя птушачкі і маленькія коні. Майстар адзначае, што свістулька — не проста цацка. Яна выконвае шмат карысных функцый: калі свісціш, развіваюцца лёгкія, таксама паляпшаецца дробная маторыка пальцаў, бо на кожным вырабе ёсць маленькія адтуліны, якія пастаянна трэба адкрываць ці закрываць. Гэта і першая музычная адукацыя, разуменне рытмаў, і добры лагапедычны трэнажор.

Іван расказаў, што выкарыстоўвае некаторыя рэдкія спосабы апрацоўкі гліны. Адзін з іх — малачэнне (вядомае яшчэ з неаліту): выраб пакрываецца малаком, праграваецца і набывае чорны колер. Такі спосаб, у адрозненне ад пакрыцця палівай і фарбавання, здаецца найбольш аптымальным, бо свістулькі дзеці бяруць у рот, а тут толькі натуральныя рэчывы. Другая тэхналогія — гартаванне, або абвар. Да апошняга часу Дашкоў быў адзіным у Беларусі, хто прымяняў гэтую тэхналогію, але нядаўна да яго далучылася яшчэ некалькі майстроў. Сутнасць у тым, што пры тэмпературы 1000 градусаў гліняны выраб дастаецца з печы абцугамі (пры такім напале ён свеціцца, як лямпачка) і акунаецца ў кіслую мучную рошчыну. Пасля гэтага выраб прамываецца ў вадзе і затым высыхае. За імгненне на ім з'яўляюцца непаўторныя малюнкі, двух аднолькавых няма — усе ўнікальныя.

Майстар адзначае, што на яго прадукцыю ёсць сталы попыт, і дадае, што беларусы пачалі калі не разумець, то інтуітыўна адчуваць розніцу паміж рэчамі, зробленымі майстрам, і звычайнымі аднадзёнкамі, і цяпер падсвядома імкнуцца да першага. Калі раней на выставах-продажах рамеснікаў было бязлюдна, то сёння за адны выхадныя ўсе іх рэчы разыходзяцца, як гарачыя піражкі.

Свістулька выконвае шмат карысных функцый: калі іграеш на ёй, развіваюцца лёгкія, паляпшаецца дробная маторыка пальцаў. Гэта і першая музычная адукацыя.

Можна лічыць, што Іван Дашкоў стаў пачынальнікам творчай дынастыі. Цяпер не толькі жонка і сыны дапамагаюць яму выбраляць штосьці з гліны. Яго бацькі таксама пачалі ствараць гліняныя цацкі, яны ўжо маюць свой адметны стыль. Брат таксама спрабуе сябе ў гэтым кірунку. Яго блізкія валодаюць і некаторымі іншымі аўтарскімі тэхнікамі: маці піша алеем, робіць карціны з лямцу, брат выбрабляе дызайнерскія рэчы для інтэр'ера. Такім чынам, у наша прагматычнае XXI стагоддзе Іван Дашкоў і ўсе яго сваякі жывуць толькі з таго, што выбрабляюць уласнымі рукамі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

Мінскі раён

Багацце бывае нематэрыяльным — засведчана экспертамі СЭТ

Статус эксперта ў галіне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Студэнцкаму этнаграфічнаму таварыству нададзены ЮНЕСКА.

Гэта навіна на ўзроўні сенсацыі: такую акрэдытацыю атрымала першая недзяржаўная арганізацыя з Беларусі. Але гэтая арганізацыя амаль 20 гадоў займалася менавіта тым, што рупліва збірала, натавала, зберагала і рыхтавала перадачу наступным пакаленням беларускіх традыцый.

Ні ў каго няма сумнення, што Беларусь — краіна багатая. І ўсе гаворкі пра наша багацце ў першую чаргу тычацца культурнай спадчыны, а калі больш канкрэтна, то таго адметнага, што ідзе ад народных традыцый і з'яўляецца нацыянальнымі асаблівасцямі. Гэта і мова, і песні, і паданні з казкамі, і каляндарныя абрады, і традыцыйныя рамесніцкія вырабы, і нават сваё асаблівае ўяўленне пра Сусвет... Усё гэта стала падставай, каб наша краіна далучылася да Канвенцыі ЮНЕСКА «Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны», прынятай у 2003 годзе. Далучыцца да Канвенцыі — гэта значыць прызнаць, што ў эпоху глабалізацыі ёсць пагроза шматаблічнасці свету і ў першую чаргу менавіта ў тым, што тычыцца існавання народных традыцый. З другога боку, пагаджацца з палажэннямі Канвенцыі — гэта значыць прымаць на сябе абавязак клопату пра захаванне традыцый і рабіць для гэтага пэўныя захады.

«Студэнцкае этнаграфічнае таварыства» — гэта арганізацыя, якая фактычна гэтыя захады і ажыццяўляе праз сваю дзейнасць, таму што займаецца канкрэтнымі справамі. Заснаванае ў 1998 годзе, таварыства ў 2002-м зарэгістравана ў Беларусі як рэспубліканскае моладзевае грамадскае аб'яднанне. За гады існавання арганізацыі сябры СЭТ правялі больш за 20 этнаграфічных экспедыцый у розныя рэгіёны Беларусі. Сабрана шмат матэрыялу, якому імкнуцца надаць новае жыццё: яго выкарыстоўваюць пры падрыхтоўцы народных свят, у моладзевых фальклорных гуртах, нават вяртаюць у месцы збору мясцовым супольнасцям альбо ва ўстановы культуры. Калекцыі, сабраныя сябрамі таварыства, выкарыстоўваюцца для экспанавання ў розных музеях і ва ўласных выставачных праектах. Уся гэтая дзейнасць і была ацэнена, калі вырашалася пытанне аб акрэдытацыі арганізацыі пры ЮНЕСКА.

Аляксей Глушко, старшыня «Студэнцкага этнаграфічнага таварыства», удакладняе:

— Такую акрэдытацыю можа атрымаць любая грамадская арганізацыя, якая мае практычнае дачыненне да захавання традыцыйнай культуры. Гэта своеасаблівая адзнака нашай шматгадовай дзейнасці. Таму што статус эксперта павінен быць падмацаваны рэальнымі справамі, пра якія мы пісалі ў сваёй заяўцы. А мы працуем з фальклорам, абрадамі, рамёствамі... Але, на мой погляд, важна тое, што мы не проста апісваем і збіраем, а імкнёмся працягваць жыццё традыцый, таму што спрыяем іх перайманню, далучаючы моладзь да народнай культуры. Важным з'яўляецца і прыцягненне ўвагі да захавання культурнай спадчыны. Акрэдытацыя пры ЮНЕСКА павышае аўтарытэт арганізацыі ўнутры краіны, дае магчымасць у якасці экспертаў адсочваць і ўплываць на рашэнні, якія прымаюцца на дзяржаўным узроўні ў галіне аховы культурнай спадчыны.

Ларыса ЦІМОШЫК.

■ Выстава

ДАПАМОГА АД ЗБАВІЦЕЛЯ

Адрэстаўраваныя абразы прадстаўлены ў музеі беларускага народнага мастацтва.

У Музеі беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах са снежня можна пабачыць выставу «Беларускі народны абраз XIX стагоддзя». Усе экспанаты — з прыватнай калекцыі Дзмітрыя Сабаніна. Гэта 44 абразы, якія атрымалі новае жыццё пасля рэстаўрацыі спецыялістамі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

Раней яны жылі для людзей: да іх звярталіся ў цяжкія хвіліны, прасілі аб дапамозе — і атрымлівалі яе. Як вы думаеце, чаму ёсць выява Маці Божай з трыма рукамі? Таму што ў яе вельмі шмат спраў: як жа столькі паспець? Абразы Маці Божай «Траяруч ыца» былі даволі распаўсюджанымі ў розных рэгіёнах Беларусі, нездарма ў Раўбічах выстаўлены Быхаўскі (Магілёўшчына) і Лунінецкі (Брэстчына). А то яшчэ і да бесцялесных сіл звярталіся ў складаных сітуацыях: прадстаўлены абраз Архангела Міхаіла паходзіць з Клецка (Міншчына). Але ў любых сітуацыях усё вяршыў той, хто прыйшоў у свет з любоўю да чалавека, каб ураташ яго ад грахоў, якія і спараджаюць усе нашы праблемы. Ён — Збавіцель — асабліва спагадлівы і добры да людзей, нават цяпер, калі абраз ужо не жыве ў храме, але яго сіла захоўваецца. І ён працягвае служыць людзям: гаспадар калекцыі дае магчымасць у каляднымі дні не толькі пабачыць беларускія абразы, але памаліцца перад імі і захапіцца. Цуд — гэта і самі выявы, і тая любоў, з якой народныя майстры ўвасаблялі хрысціянскую сутнасць нашай зямлі.

Ларыса ЦІМОШЫК

А ведаеце, панове, як даўней елі і пілі ў добрых шляхецкіх дамах старой Літвы? Ну, напрыклад, напрыканцы 1820-х гадоў, у залатыя бесклапотныя часы, дзе-небудзь у Навагрудскім або Слонімскім павеце? О, то незвычайныя старасвецкія звычаі, пра якія добра распавёў пан Лявон Патоцкі, а з яго слоў і я перакажу.

Гастранамічны дзень шляхціца-літвіна

*Дзень шляхціца распачынаўся кавай з вяршкамі. Каля дзясятай гадзіны наведаць хатнюю «аптэчку», каб выпіць па кілішку анісаўкі, кменаўкі або памаранчаўкі і закусіць пернічкам або сушанай сліўкай на патычцы, было рэчу абсалютна неабходнай. Аб адзінаццатай гаспадар, падняўшы за здароўе гасцей кілішак аераўкі, для ўзбуджэння апетыту частаваў ёй усіх гасцей. А таксама частаваў іх лёгкай закускай, якая складалася з калдуноў, бігасу, каўбасаў, зразаў. Вакол гэтых страў стаялі паўміскі з рулядай, разнастайнай вяндлінай і сырамі. Смагу ж гасілі портарам і півам тавяньскім. На стол жа па-сапраўднаму падавалі а другой гадзіне. Абеду з **-наццаці страў папярэднічала гарэлка, а спадарожнічала віно...*

Па абедзе зноў разносілі каву з вяршкамі, праз пару гадзін — садавіну і канфітуры. А паміж гэтымі прыёмамі, у залежнасці ад сезона, улетку — агуркі з мёдам, зімой — арэхі і мак, смажаны ў мёдзе. А шостай гадзіне надыходзіла чарга гарбаты з печывам, а адразу па ёй гаспадар заклікаў: «Панове! Завод жыцця круткі, напіймася вудкі!» А дзявятай — вячэра з 5 або 6 страў, з боязі, каб уначы з голаду не прысніць цыганоў. Недзе каля поўначы, каб не ісці ўсё ж спаць нашча, падавалі верашчаку. Затым пару кілішкаў крупніку або пуншыку належала выпіць — і вось гэты ўжо апошні прыём называўся «падкуркам».

Вось так, мае даражэнькія: людзям, што мала елі, тады не давяралі, бо лічылі, што за стрыманасцю тоіцца або зайздроснасць, або зласлівасць. Тады казалі, што кухмістр выязджае з панскага двара толькі тады, калі прап'юць-праядуць апошняга вала і карову. І гэта ж ужо прасветленае XIX стагоддзе, час філаматаў ды філарэтаў, Віленскага ўніверсітэта, раманцызму і іншых узнёслых рэчаў! Што ж тады казаць пра саксонскія часы, калі формулай добрых паводзін лічылася «еш, пі і папушчай паса»? Дык вось, калі цікава, і парачка рэцэптаў са штодзённага рацыёну, апісанага панам Патоцкім.

Калмусоўка (аераўка)

Складнікі: 50 г свежага або 20 г сушанага кораню аеру, лыжка дзёртай апельсінавай скуркі, некалькі каліваў кардамону і тры пальцы карыцы, 3 літры гарэлкі, 100 г каньяку.

Прыгатаванне: Усе зёлкі і спецыі засыпаць у слоік, заліць гарэлкай і пакінуць на 8-10 дзён у цёплым месцы, штодня трасучы слоік. Прафільтраваць, змяшаць з каньяком, разліць па бутэльках, пакінуць настойвацца некалькі месяцаў.

Некалі дасканаламі закускай да аераўкі лічыліся цукаты з таго ж аеру.

Верашчака старадаўняя ад кухмістра Верашчакі

Складнікі: 500 г белай каўбасы, 1 шклянка піва, 1 цыбуліна, 1 шклянка мукі, 2 лыжкі тлушчу, соль, перац,1 лыжка воцату, цукар — на смак.

Прыгатаванне: Каўбасу адварваць 30 хвілін у піве, разбаўленым вадой. Цыбулю дробна нарэзаць і падсмажыць на невялікай колькасці тлушчу. Муку і тлушч падсмажыць да ўтварэння трохі падрумяненай масы, якую развесці 1/2 шклянкі адвару ад каўбасы, якая варыцца. Атрыманы соус заправіць соллю, перцам, цукрам і воцатам. Каўбасу парэзаць на кавалачкі даўжынёй некалькі сантыметраў і каля 10-12 хвілін патушыць у соусе на вельмі малым агні.

«КАНЁК-ГАРБУНОК»
І ІНШЫЯ МУЛЬТФІЛЬМЫ ЛЬВА МІЛЬЧЫНА
На работах нашага суродзіча славуты Уолт Дзісней вучыўся ствараць амерыканскую анімацыю

Гартаючы раз-пораз выдатны энцыклапедычны даведнік «Беларускі Саюз мастакоў», зрэдзьчасу спыняюся на артыкуле, прысвечаным Ісаку Восіпавічу Мільчыну (1894—1943). Усяго дзевяць радкоў... Дазволю сабе працытаваць іх: «... вучыўся ў школе малявання Я. Кругера ў Берліне (1911—1914). Член Усебеларускага Аб'яднання мастакоў — першай арганізацыі мастакоў Беларусі (1927—1928), член Рэвалюцыйнай асацыяцыі мастакоў Беларусі (1928—1931). Працаваў у кніжнай графіцы. Сярод твораў: іл. да кнігі Шолама-Алейхема «Сярэбраны». Загінуў у фашысцкім гета».

І нешта ж, нейкая струнка памяці чапляла, прымушала спыняцца, перачытваць гэтыя радкі, углядацца ў здымак Ісаака Мільчына. І ўсё ж такі разгадка прыйшла: успомнілася дзяцінства, цітры розных мультфільмаў. Так, і там — Мільчын!.. Але ж якая сувязь? Мультфільмы, відавочна, пасляваенныя.

Пачаў цікавіцца больш дэталёва. Па ініцыялах атрымліваецца, што да мульцікаў мае дачыненне іншы Мільчын. Высвятляецца: Леў Ісакавіч Мільчын — пэўна ж, сын... Тым больш што месцам нараджэння мастака-мультыплікатара пазначаны Мінск. Вядома, што Леў Мільчын пакінуў Беларусь перад вайною... А ўжо ў пасляваенныя гады як мастак (а часам яшчэ і як рэжысёр) ствараў вядомыя і сёння мультфільмы. Сярод іх — « Канёк-Гарбунок» (копію яго славуты Уолт Дысней купіў у «Саюзмультфільма», каб вучыць мастакоў і рэжысёраў амерыканскіх мульцыкаў), «Бабулін парасон», «Светлячок», «Маша болей не гультайка», «Маша і чароўнае варэнне», «Як Маша з падушкай пасварыліся», цыкл «Апавяданні старога марака»...

Паспрабаваў адшукаць нейкія сляды Мільчынасына. Пазваніў у Маскву на колішні «Саюзмультфільм». Там адказалі на трэці ці чацвёрты зварот: «Ён даўно памёр...» І кінулі трубку. Шукаючы славутых землякоў не толькі ў Беларусі, але і ў свеце, да падобнага стаўлення, да таго, што і на дзясятак лістоў не адказваюць, я ўжо прызвычаіўся. Хоць мірыцца з гэтым не магу і часам падоўгу грукаюся ў зачыненыя дзверы... Замест некалі ўсемагутнай карпарацыі «Саюзмультфільм», славу якой ствараліі работы Мільчына, звярнуўся да Леаніда Аронавіча Шварцмана. Акадэмік «НІКІ», яркая, шматгранная асоба, ён таксама ўсё жыццё аддаў мультыплікацыі. Гэта ён, Шварцман, наш зямляк (нарадзіўся ў Мінску), прыдумаў, намаляваў Чабурашку такім, якім мы ведаем, уяўляем казачнага героя Эдуарда Успенскага. Пра Шварцмана я пісаў некалькі разоў для самых розных выданняў Беларусі. З Леанідам Аронавічам мы ліставаліся, перазвоньваліся. Чалавек ён выключна адказны і абавязковы. Пацікавіўся ў яго і пра Мільчына. Пра гэтага мастака мы неяк раней не гутарылі...

А далей — як у казцы!.. Паслухайце, што расказаў вядомы расійскі мастак:

— Дык гэта ж сябар майго дзяцінства!..

— ???!..

— І ён, як і я, — мінчанін... Я нарадзіўся 30 жніўня 1920 года. Лёва — 18 жніўня. Абодва пайшлі ў «нулёўку» ў 1927 годзе. У адну школу — мінскую школу нумар 5... Абодва з самага маленства малявалі. Але так, як маляваў Лёва, ніхто з нас, нашага акружэння не маляваў. Ён забываўся на ўсё на свеце, маляваў на ўроках. Яго малюнкі — гэта шматфігурныя кампазіцыі: рыцарскія баі, марскія бітвы, грандыёзныя будоўлі дамоў і заводаў... Нас, яго аднакласнікаў, здзіўляла фантазія Лёвы, хуткасць, з якой ён маляваў...

Разам Шварцман і Мільчын пайшлі і ў мастацкую студыю. Выкладаў у будучых мультыплікатараў Валянцін Віктаравіч Волкаў. Гэта ўжо было, пэўна, пасля 1929 года. Бо вядома, што да 1929-га Волкаў працаваў у Віцебскім мастацкім тэхнікуме.

Безумоўна, школа такога вялікага мастака паўплывала на фарміраванне таленту падлеткаў. Валянцін Віктаравіч заахвочваў юных мастакоў да шматжанравай працы. І калі надышоў час выбару прафесіі, сумненняў у тым, якую жыццёвую сцяжыну выбраць, не было. Абодва — Леў і Леанід — выправіліся ў Ленінград, каб паступаць у Акадэмію мастацтваў. Але лёс распарадзіўся так, што не паступілі.

— Я пайшоў вучыцца ў школу пры акадэміі — расказвае Леанід Аронавіч, — а Лёва паехаў у Маскву і паступіў на мастацкі факультэт Усесаюзнага дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі. У 1943 годзе ён блісканула абараніў дыплом на тэму «Ціль Уленшпігель». Адна з першых прац Мільчына ў кінематаграфіі — «Нашэсце»...

Мастаком-пастаноўшчыкам на «Нашэсце» юнага Льва Мільчына запрасіў Абрам Мацвеевіч Роам. Магчыма, спрацавала і пачуццё зямляцкасці. Роам — з Вільні, добра ведаў Беларусь. У свой час працаваў выкладчыкам ва Усесаюзным дзяржаўным інстытуце кінематаграфіі. Першы свой фільм Абрам Мацвеевіч зрабіў яшчэ ў 1924 годзе... За «Нашэсце» Роам атрымаў Сталінскую прэмію. А Льва Мільчына проста заўважылі. І ўжо праз год наш зямляк робіць «Канёк-Гарбунок» з «бацькам савецкай мультыплікацыі» рэжысёрам Іванам Пятровічам Івановым-Вано. Да гэтага твора будзе яшчэ і вяртанне — у 1975 годзе. Але і тая, 1945 года, версія выклікала вялікую цікавасць у гледачоў, у калег па працы. Амаль праз 40 гадоў пасля вайны Мільчын і ўжо 84-гадовы яго настаўнік зрабілі яшчэ адзін досыць цікавы мультфільм — «Казку пра цара Салтана».

— Лёва, — успамінае далей Шварцман, — быў яшчэ і выкладчыкам у мяне — ва Усесаюзным інстытуце кінематаграфіі. Выкладаў карыкатуру і шарж. Тады я і даведаўся, што бацька, маці і сястрычка Лёвы загінулі ў гета. А да вайны жылі яны на Широкай вуліцы на беразе Свіслачы, якраз насупраць тэатра оперы і балета. Бацька Лёвы — мастак...

Такая вось разгадка, такія вось сувязі паміж Мільчынымі. Леў Ісакавіч таксама ўжо пайшоў з жыцця — у 1987 годзе. А мультфільмы, зробленыя ім, па-ранейшаму радуюць юнага гледача і ў Расіі, і ў Беларусі, і ў іншых краінах на постсавецкай прасторы, а мо і не толькі на постсавецкай...

Кастусь ХАДЫКА.